**13 жніўня 2023 года - 80 гадоў з дня нараджэння ЛЕАНІДА ПЛАТОНАВІЧА ПРЫМАЧУКА (1943), вучонага-матэматыка, кандыдата фізіка-матэматычных навук**



Леанід Платонавіч Прымачук нарадзіўся 13 жніўня 1943 года ў в. Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. ў шматдзетнай сям'і. Бацька, Платон Канстанцінавіч, працаваў цесляром, маці, Ганна Максімаўна, даяркай у калгасе. Усе дзеці атрымалі вышэйшую адукацыю, сталі людзьмі дастойнымі і паважанымі. Яго старэйшы брат Іван Платонавіч – гісторык, эканаміст, прафесар Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута.

Дзяцінства Леаніда Прымачука прыпала на цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады. Вучыўся у пачатковай школе ў в. Мацы, потым у сярэдняй школе ў в. Стрыгава, што за 3 км ад роднай вёскі. Яшчэ ў школьныя гады супрацоўнічаў з раённай газетай «Камуністычная праца» (цяпер «Кобрынскі веснік») і хацеў стаць журналістам, рыхтаваўся паступаць у ВНУ па гэтай спецыяльнасці. Але ў сілу шэрагу абставінаў лёс склаўся інакш.

Пасля заканчэння сярэдняй школы Леанід Прымачук паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна. У 1960–1965 гадах – студэнт матэматычнага факультэта БДУ, аднаго з самых элітных факультэтаў беларускіх ВНУ. У 1965 годзе паступіў у аспірантуру БДУ. Кандыдацкую дысертацыю «О разрешимости краевых задач со сдвигом» абараніў у 1970 годзе. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1970). У 1973 годзе яму прысвоена вучонае званне дацэнта.

З 1967 года па 2008 год Л. П. Прымачук працаваў у БДУ на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка, асістэнта кафедры матэматычнага аналізу, намесніка дэкана матэматычнага (з 1975 года – механіка-матэматычнага) факультэта. Удзельнічаў у падрыхтоўцы нацыянальных кадраў некаторых краін Афрыкі. У 1973–1976 гадах чытаў лекцыі ў адным з універсітэтаў Алжыра, у 1981–1984 гадах– дзяржаўным універсітэце г. Уагадугу, сталіцы Верхняй Вольты (з 1984 года – Буркіна-Фасо). Больш за 10 гадоў (1985–1996) працаваў дэканам механіка-матэматычнага факультэта БДУ.

Л. П. Прымачук з'яўляецца спецыялістам у галіне даследавання краявых задач тэорыі аналітычных функцый.

Неаднаразова выступаў з дакладамі на міжнародных канферэнцыях і кангрэсах. Дацэнт кафедры тэорыі функцый БДУ. Апублікаваў звыш 50 навуковых і навукова-метадычных работ. Нягледзячы на паважаны ўзрост, Леанід Платонавіч працягвае навуковую працу.

Узнагароджаны Граматай (1983) і Ганаровай граматай Міністэрства выйшэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР (1987), нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі» (2003), Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (1993, 2008). Прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2018 г., дапоўнены ў 2023 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

## Працы Л. П. Прымачука

**Бровка, Н. В.** Математический анализ. Функции многих переменных и дифференциальные формы : учебное пособине / Н. В. Бровка, Л. П. Примачук. – Минск : БГУ, 2010. – 351 с. : ил. – (Классическое университетское издание).

**Бровка, Н. В.** Замена переменных в дифференциальных выражениях : практикум [для студентов вузов] / Н. В. Бровка, Л. П. Примачук. – Минск : БГПУ, 2005. – 44 с.

**Дифференциальные формы** : учебно-методическое пособие для механико-математического факультета специальности Н.01.01.00 — «Математика» : в 2 ч. / Л. П. Примачук, Н. В. Бровка, А. Э. Малевич ; Белорусский государственный университет, Механико-математический факультет. – Минск, 1999–2000.

**О разрешимости краевых задач со сдвигом** : автореферат диссертации … кандидата физико-математических наук : специальность 01.002 Функциональный анализ и теория функций / Леонид Платонович Примачук ; Белорусский государственный университет им. В. И. Ленина. – Минск, 1969. – 12 с.

**Рогозин, С. В.** Факторизация рациональных матриц функций второго порядка / С. В. Рогозин, Л. П. Примачук, М. В. Дубатовская // Аналитические методы анализа и дифференциальных уравнений : материалы 10-го междунар.

семинара. 13–17 сентября 2021 г., Минск. - Минск, 2021. – С. 76–77.

**Трехэлементная краевая задача на окружности** с рациональным коэффициентом / Л. П. Примачук, С. В. Рогозин, М. В. Дубатовская // Аналитические методы анализа и дифференциальных уравнений : материалы междунар. семинара. 17–21 сентября 2018 г., Минск. - Минск, 2018. – С. 69.

**Бровка, Н. В.** О краевой задаче с сопряжением на единичной окружности / Н. В. Бровка, Л. П. Примачук // Аналитические методы анализа и дифференциальных уравнений : тезисы докладов междунар. науч. семинара. 11–14 сентября 2012 г., Минск. - Минск, 2012. - С. 16.

**Примачук, Л. П.** Дифференциальные формы : учебно-методическое пособие для механико-математического факультета специальности Н.01.01.00 — «Математика» : в 2 ч. / Л. П. Примачук, Н. В. Бровка, А. Э. Малевич ; Белорусский государственный университет, Механико-математический факультет. - Минск, 1999-2000.

**Примачук, Леонид Платонович**. О разрешимости краевых задач со сдвигом : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата физико-математических наук, специальность 01.002 Функциональный анализ и теория функций / Леонид Платонович Примачук ; Белорусский государственный университет им. В. И. Ленина. – Минск, 1969.

## Аб жыцці і дзейнасці Л. П. Прымачука

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Абламейко, С. В.** Математика и математики БГУ и Беларуси: 100 лет развития / С. В. Абламейко, М. А. Журавков. – Минск : БГУ, 2021. – 255 с. : ил. – Из содерж.: Л. П. Примачук. - С. 57, 58.

**Знаменитые земляки** // Открытое акционерное общество «Стригово» / [автор текста Е. Жук ; главный редактор В. Шпарло ; фото А. Рыбачука, Г. Козловского]. - Брест, 2021. – С. 20-21. : ил., цв. ил., портр.

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Малая радзіма вялікіх людзей : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 460-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в.

Мацы Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2023. – С. 23 : фат. – (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2020. –С. 122-123 : фат..

**80 гадоў** з дня нараджэння Л. П. Прымачука (1943) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. - С. 72.

**Известные** люди. **Примачук Леонид Платонович** // Азбука моей малой родины : 505-летию Стригово посвящается / ГУК «Стриговская публичная библиотека», ГУО «Стриговский детский сад - средняя школа», ГУК «Стриговский центр культуры и досуга» ; под ред. С. Д. Курачук. – Кобрин : Центральная районная библиотека, 2018. – С. 12.

**Вядомыя** землякі. **Прымачук Леанід Платонавіч** : [выпускнік Стрыгаўскай сярэдняй школы] // Скрозь памяць стагоддзяў : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 500-годдзя з часу першага згадвання ў пісьмовых крыніцах в. Стрыгава, в. Балоты Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2013. – С. 20 : фат. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

*Рэгіён:*
Кобрынскі раён
Мацы
*Імёны:*
Прымачук Леанід Платонавіч
*Прадметы:*
Вучоныя
Матэматыкі